А. Д. Дабравольскі

# КРЫЛАТАЯ ГУСАРЫЯ КАРАЛЕЎСТВА ПОЛЬСКАГА І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

*Прадстаўлена інфармацыя пра адзін з найбольш эфектыўных родаў войск XVI – XVII стст. – гусарах Каралеўства Польскага і Рэчы Паспалітай.*

Крылатая гусарыя Каралеўства Польскага, а затым і Рэчы Паспалітай існавала з пачатку XVI да апошняй чвэрці XVIII стст. Лічыцца, што распаўсюджанне ў ВКЛ і Польшчы кавалерыі, узброенай шчытамі і дзідамі, вядзе свой пачатак ад сербска-венгерскай традыцыі, дзе ўжо ў XV ст. шырока выкарыстоўваліся лёгкія вершнікі – гусары, якія цудоўна зарэкамендавалі сябе ў барацьбе з туркамі. Хаця першапачаткова гусарыя была сфарміравана як лёгкая конніца, у 1577 г. кароль Стэфан Баторый правёў стандартызацыю рыштунку гусарыі. У такім выглядзе яна і стала найбольш вядомай і адной з самых эфектыўных цяжкіх кавалерый Еўропы. На агульны знешні выгляд гусар і іх экіпіроўку вялікі ўплыў аказалі турэцкія конныя войскі «Дэлі», якія таксама замацоўвалі крылы на спіне і насілі звярыныя шкуры. На ўзбраенні гусар быў цяжкі латны даспех (кальчуга, нагруднік ці кіраса, спецыфічны шлем), піка, шабля і, вядома ж, крылы. Пікі ўяўлялі сабой спецыяльна падрыхтаваныя рыцарскія дзіды, полыя, з меднай шарападобнай гардай. У розныя перыяды часу піка мела розную даўжыню, аднак важна адзначыць, што такія пікі былі даўжэйшымі за пікі праціўніка, што дазваляла супрацьдзейнічаць пікінерам. Удар такой пікі пры руху галопам лёгка прабіваў жалезныя панцыры і шчыты, што дазваляла эфектыўна паражаць пяхоту праціўніка падчас першай жа атакі і пры праломе шэрагаў. Часта такія пікі ламаліся пасля аднаго ўдара ці губляліся падчас бою. Калі атака была паспяховай і варожы строй быў прарваны, гусары працягвалі атаку, выкарыстоўваючы канчары, шаблі ці іншую халодную зброю. У іншым выпадку гусары адыходзілі і пачыналі новую атаку. Гусарскія крылы ўяўлялі сабой мноства пер'яў, размешчаных на драўлянай раме, якая мацавалася да сядла ці спіны вершніка. Існуе некалькі версій, якія тлумачаць прызначэнне гэтых крылаў. Найбольш верагодная сцвярджае, што крылы былі патрэбны для таго, каб дэмаралізаваць праціўніка. Таксама гэтым падкрэслівалася элітарнасць крылатай гусарыі. У баі крылатыя гусары дзейнічалі наступным чынам. Харугва гусараў выстраівалася ў шарэнгі, колькасцю тры ці больш. Пры гэтым у першых шэрагах знаходзіліся набольш вопытныя таварышы, а ў задніх – іх пачтовыя. Атака на праціўніка пачыналася з адлегласці прыкладна ў 100 крокаў. Гусары паступова паскаралі тэмп. Часцей за ўсё пасля першай такой атакі варожыя шэрагі аказваліся праломленымі. Пасля гэтага гусары пераходзілі ў блыжні бой, выкарыстоўваючы канчары і шаблі. Практычна ва ўсіх бітвах, у якіх бралі ўдзел крылатыя гусары, рашаючы уклад у перамогу ўносіў менавіта гэты род войск. Напрыклад, в бітве пад Оршай 1514 г. гусары здолелі паспяхова адбіць атаку рускага палка М.Булгакава, што адыграла вельмі важную ролю ў далейшым развіцці змагання. У бітве каля Любяшова 1577 г. крылатым гусарам удалося звярнуць у бегства сілы сепаратыстаў Гданьска за адну атаку. У бітве каля Клушына 1610 г. войска Рэчы Паспалітай было прадстаўлена 6800 кавалерыстамі, 5500 з якіх складалі крылатыя гусары, армія ж Рускага Царства і Швецыі складалася з 30000 солдат з рускага боку і 5000 наёмнікаў з боку Швецыі. Руска-шведская армія была разбіта за дзесятак атак крылатай гусарыі. Нягледзячы на такую эфектыўнасць, па меры развіцця і распаўсюджвання агняпальнай зброі крылатая гусарыя страчвала сваю баяздольнасць, не маючы сіл супрацьпаставіць што-небудзь шчыльнаму артылерыйскаму і збройнаму агню. У пераважнай большасць бітваў другой паловы XVll і XVlll стст. з удзелам крылатай гусарыі, гэты род войск не быў у стане нават пачаць атаку, што вяло да адступлення. У той час як у XVll ст. заходнееўрапейскімі арміямі цяжкая конніца практычна не выкарыстоўвалася, крылатая гусарыя існавала як эфектыўны сродак у вайне з туркамі і рускімі. Тым не менш, сойм скасаваў крылатую гусарыю ў 1775 г.

### *Спіс літаратуры*

1. Польские крылатые гусары 1576 – 1775 / под ред. В. И. Киселёва. – Артёмовск: Новый солдат: военно-исторический альманах, 2002. – Т. №142. – 40 с.
2. Солдатенко, А. Польская гусария 1500 – 1776 гг./ А, Солдатенко. – СПб.: Орел, 1993. – Т. № 3. – 40 с.

*Добровольский Олег Дмитриевич,* студент ФИТиУ БГУИР, odobro33@gmail.com
*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна,* зав.кафедрой гуманитарных дисциплин, к. и. н., доцент.